Дунаева І.С, выпускніца спецыялізацыі “Этнафоназнаўства”
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік - Варфаламеева Т.Б.,
канд. мастацтвазнаўства, дацэнт

# КАНТРАСТНАЯ ПАЛІФОНІЯ І ЯЕ ПРАЯВЫ Ў ЭТНАФАНІЧНЫХ СТЫЛЯХ РЭГІЁНАЎ БЕЛАРУСІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адной з глабальных праблем сучаснай беларускай культуры з’яўляецца праблема захавання і перадачы наступным пакаленням эстэтычных каштоўнасцей аўтэнтычнай народнай спадчыны. Вядучае месца займае тут песня, якая ў беларускай музычнай традыцыі паўстае як асноўны яе складнік – шматфункцыянальны, шматжанравы, у мностве рэгіянальных версій і варыянтаў, рознаквецці музычна-паэтычных форм і стыляў.

Спецыфіка сучаснай культурнай сітуцыі на Беларусі, калі аўтэнтычныя формы народнай песеннай культуры паступова знікаюць, абвастрае патрэбу ў мэтанакіраваных намаганнях па засваенню асаблівасцей аўтэнтычнага выканальніцтва – песеннага і інструментальнага. Напружанасць становішча ў пэўнай ступені можа змякчыць павелічэнне колькасці аматарскіх фальклорных калектываў, якія б пад кіраўніцтвам спецыяльна падрыхтаваных кіраўнікоў здолелі ў вуснай форме авалодаць манерай аўтэнтычных спеваў і ігры на народных інструментах і тым самым захаваць сутнасныя эстэтычныя нормы беларускага народнага музычнага мастацтва.

Дадзены артыкул прысвечаны адной з найбольш спецыфічных і яскравых праяў народнапесеннай культуры беларусаў – кантрастнай паліфоніі - музычнаму складу, які ў жывой спеўнай традыцыі праяўляецца ў розных відах і тыпах.

Па меркаваннях этнамузыколагаў, аснова музычнага стылю беларускай традыцыі – песні старажытнага гістарычныга пласта:

каляндарна-земляробчыя і сямейна-абрадавыя [4, 23]. Аб гістарычнай глыбіні каляндарнай абраднасці сведчаць і даследванні культуролагаў. Апошнія лічаць каляндарныя святы першаснымі формамі протакалендара, якія маглі з’явіцца яшчэ ў палеаліце [5, 120].

Адзін з адметных выканальніцкіх стыляў на беларускім Падзвінні – кантрастная паліфонія. Класічнае тлумачэнне гэтага паняцця прадстаўлена А. Д. Троіцкай, згодна з якім “кантрастная паліфонія - аднaчасовае гучанне дзвюх і больш музычных пабудоў. Кантраст праяўляецца меладычна, рытмічна і тэмбрава-фактурна [2, 261]. Такая фальклорная з’ява сустракаецца ў асноўным у абрадавым фальклоры.

У беларускай фальклорнай традыцыі можна вызначыць **два тыпы** кантрастнай паліфоніі: уласна музычная (меладычная і рытмічная разнастайнасць у межах аднаго песеннага выказвання) і паліфонія, якая праяўляецца кантрастным спалучэннем асобных самастойных мелодый у аданачасовым гучанні – кантрастна-лінерная паліфонія.

Да першага тыпу кантрастнай паліфоніі адносяцца такія разнавіднасці як гетэрафонія, шматгалоссе кантавага тыпу, падгалосачная паліфонія (“спевы з падводкай”). Да другога тыпу дапасуецца антыфоннае спяванне (выкананне песні (куплета) па чарзе дзвюма і больш групамі (па народнай тэрміналогіі - у дзве-тры і больш “шоры”, “змены”, “хоры”) ) [6, с. 109], яно часта пераходзіць ў канон на вытрыманым бурдоне папярэдняй спеўнай групы. Да гэтага тыпу варта аднесці ўнікальную этнафанічную з’яву кантрасна-лінеарнага антыфоннага спявання - “Барана” – адметнае спалучэннем песенных выказванняў розных па меладычнаму і жанрава-тэматычнаму зместу (спеўныя гурты аднчасова могуць выконваць купальскую, вясельную, калядную, веснавую, іншыя песні) [3, 31; 1, 21].

Кантрасна-лінеарная паліфонія сустракаецца ў этнафанічных традыцыях усіх славянскіх народаў. Такі спецыфічны тып сумесных спеваў – кантрастна-лінеарная паліфонія – сустракаецца ў розных рэгіёнах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі і рэпрэзентаваны ў адначасовым выкананні некалькіх каляндарных або сямейна-родавых песень (розныя па музычныму і тэматычнаму зместу). Кантрастная лінеарнасць ўзнікае, як правіла, у рытуальных або рытуалізаванных абставінах. Прыклад харавых антыфонаў у абрадзе “Ваджэння і пахавання стралы” Веткаўскага Пасожжа (калі два хора жанчын, рухаючыся з розных канцоў вёскі, сустракаюцца на перакрыжаванні і, ўтвараючы агульны карагод, “крывы танок”, дапяваюць свае “стрэльныя” песні, часам на розныя тыпавыя напевы). Этнафонія жніва ва ўсіх рэгіёнах прадстаўляе кантрастнае спяванне, калі, аб’ектыўна, ў розных канцах поля жанчыны спяваюць розныя жніўныя песні. У беларускіх абрадах сямейна-родавага цыкла кантрастна-лінеарная паліфонія найбольш яскрава праяўляецца ў вяселлі і пахаванні. Экспрэсія выканання такіх спеваў гаворыць аб важным сэнсе, аб неадназначным стане чалавечай свядомасці і эмацыйным пад’ёме ў час калі іх спяваюць.

У кантэксце народнапесеннай культуры Беларусі ў цэлым гэтыя тыпы кантрастнай паліфоніі найбольш рэльефна праяўляюцца пры супастаўленні рэгіянальных этнафанічных асаблівасцей. (таб.1).

Табліца 1. Рэгіянальныя этнафанічныя асаблівасці

| Гісторыка – этнаграфічны рэгіён | **Этнафанічныя асаблівасці** | | |
|---|---|---|---|
| | пераважныя музычныя стылі | асноўныя музычна-стылявыя асаблівасці | адмысловыя, адметн[ыя] песенныя жанры |
| Падзвінне | **Манодыя, антыфонны тып сумеснага спявання (на Полаччыне), кантрастна-лінеарная паліфонія** | **Перавага строгіх формульных напеваў каляндарна-земляробчага і сямейна-родавага цыклаў** | **«Цярэшкі», масленічныя, валачобныя, «юраўскія», купальс[кія], восеньскія; хрэсьбінныя. Вясельныя, галашэ[нні]** |
| Усходняе Палессе | **Гетэрафонія (полірытмічны тып манодыі). Спевы «з падводкай» (“прамой” і “с закруткамі”)** | **Сукупнасць стылявых асаблівасцей, уласцівых рэгёнам Падняпроўя і Палесся** | **Масленічныя, вясня[нкі], веснавыя карагод[ы] абрадавага цыкл[у] «Ваджэнне і пахаван[не] стралы», русальныя, калядн[ыя]. Пазаабрадавая ліры[ка]** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| Заходняе Палессе | **Дыяфонія на бурдоннай аснове. Спевы «з падводкай» (“прамой”, тыпу ўторы)** | **Уплыў песеннага стылю Украіны, разнастайнасць мясцовых лакальных песенных традыцый** | **Калядныя песні (у ты ліку пры ваджэнн “казы”), жніўныя, вясельныя. Пазаабрадавая ліры** |
| Падняпроўе | **Манодыя (на поўначы), гетэрафонна-манадыйныя спевы «з пераліваміі» (на ўсходзе), гетэрафонна-бурдонны тып сумеснага спявання (на поўдні і паўднёвым усходзе), падводка “з падцягам”** | **«Карагоднасць» народна-песеннай традыцыі** | **Усе жанры каляндар абрадавага, сямейн абрадавага цыклаў Пазаабрадавая ліры** |
| Панямонне | **Манодыя, шматгалоссе кантавага тыпу, спевы «з падводкай» (“прамой”, тыпу ўторы) .** | **Значная ступень лірызацыі большасці абрадавых мелодый** | **Веснавыя, валачобны юраўскія, жніўныя Пазаабрадавая ліры** |
| Цэнтральная Беларусь | **Змяшэнне стыляў Панямоння, Паазер’я, Падняпроўя, Палесся.** | **Наяўнасць стыляў, уласцівых Панямонню, Паазер’ю, Падняпроўю, Палессю.** | **Змяшэнне жанраў уласцівых Панямонн Паазер’ю, Падняпро Палессю.** |

У заключэнне магчыма зрабіць выснову, што такое багацце тыпаў шматгалосся выяўляе акустычны код беларускай музычнай традыцыі, мае вялікі даследчы патэнцыял і з’яўляецца крыніцай творчасці для педагогаў і спеўных гуртоў - пераймальнікаў этнафанічных стыляў Беларусі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ:

1. Бяркові ч Т. “Купальская барана (да пытання рытуальна-гульнявых бясчынстваў летняга сонцавароту)”/Т. Бяркові ч//Праблемы этнамузыкалогіі і гісторыі музыкі ў сучасных даследаваннях: Б. дакл. 3-х. навук. чытанняў памяці Л.С. Мухарынскай ( Мн, 24-25 сакавіка 1994 г.). - Мн.: Беларуская акадэмія музыкі, 1996.- с.21.

2. Восточнославянский фольклор: Слов. научн. и нар. тэрминалогии/ Редкол.: К. П. Кабашников (отв. Ред. ) и др.– Мн.: Навука и тэхніка, 1993.– 478 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Можейко, З.Я. Календарно - песенная культура Белоруссии : опыт системно – типологического исследования / З.Я. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1985. – 247 с.
4. Мухарынская Л.С. , Якіменка Т.С. Беларуская народная музычная творчасць: Вучэб. дапам. для муз. ВНУ.– Мн.: Выш. шк., 1993.– 343 с.: іл.

5. Санько С. Штудыі з кагнітыўнай і кантрастнай культуралёгіі/ Санько С. – Менск: БГАЦ, 1998. – 190 с.
6. Тавлай Г. (Санкт-Петербург). К вопросу о Полоцком обрядовом многоголосии. // Славянская этномузыкология: Направления. Методы. Концепции: Тез. докл. Международной научной конференции к 90-летию Л.С.Мухаринской (1906- 1987).- Мн.: Белорусская государственная академия музыки, 1996.- 131 с.: ил.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ